# Перадавому атраду будаўнікоў палітэхнічнай школы

Цэнтральны Камітэт комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі шле гарачае большэвіцкае прывітанне ўсебеларускаму з'езду настаўнікаў - ударнікаў і ў яго асобе ўсяму чырвонасцяжнаму настаўніцтву БССР.

Вам, таварышы настаўнікі, партыя даручыла ганаровую і адказную задачу — выхаванне новага пакалення будаўнікоў соцыялізму, выхаванне людзей, здольных быць актыўнымі барацьбітамі за комунізм.

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, на чале з правадыром і настаўнікам сусветнага пролетарыята тав. Сталіным, узброенае гістарычнымі рашэннямі ЦК ВКП(б) аб школе, совецкае настаўніцтва БССР упарта змагаецца за выкананне ўскладзенай на яго задачы па будаўніцтву палітэхнічнай школы.

У гэтай барацьбе ганаровае месца належыць вам, таварышы настаўнікі-ўдарнікі, вам — верным памочнікам партыі ў будаўніцтве бяскласавага соцыялістычнага грамадства.

Ваш з'езд на аснове гістарычных рашэнняў 17 з'езда партыі павінен намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па далейшаму росту нашай школы, узняцця яе работы на ўзровень задач другой соцыялістычнай пяцігодкі. Вы павінны намеціць практычныя мерапрыемствы па забеспячэнні выхавання ў нашай школе самаадданых барацьбітоў за пролетарскі інтэрнацыяналізм, умацаваць барацьбу за партыйнасць вучобы, рашуча змагаючыся з усякімі спробамі класава-чужых элементаў прышчапіць дзецям элементы антыпролетарскай ідэалогіі.

Падводзячы вынікі вашай работы, перадаючы свой лепшы вопыт астатняй масе настаўніцтва, падцягваю-

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы